894296



# З глыбінь народных

894296
8 Бел
3-11

# З ГЛЫБІНЬ НАРОДНЫХ

Мінск
Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна
1982

## ЗМЕСТ


*С. Х. Александровіч.* На самым пачатку... *(Матэрыялы да біяграфіі)* . . . 3

*Т. І. Шамякіна.* Час і прастора ў трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» . . . 21

*Г. М. Праневіч.* Генетычныя асновы вобразнасці *(«Новая зямля» Я. Коласа і «Слова аб палку Ігаравым»)* . . . 29

*В. К. Каратай.* Вечная прага нязбытнага *(Філасофскія нюансы паэмы «Сымон-музыка»)* . . . 41

*Л. І. Прашковіч.* Проза музычнай арганізацыі *(Пра паэтыку аповесці Якуба Коласа «Дрыгва»)* . . . 48

*В. В. Каладзінскі.* Фальклорная аснова апавяданняў «Казкі жыцця» . . . 56

*М. Б. Яфімава.* «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа . . . 65

*В. А. Лашкевіч.* Якуб Колас аб дзіцячай літаратуры і дзіцячым чытанні . . . 74

*Т. В. Кабржыцкая.* Урок прысвячаецца «Чымгану» . . 80

*В. І. Локун.* Духоўны воблік коласаўскага героя . . 85

*Л. К. Тарасюк.* Вобраз духоўнага пошуку . . . . 92

*С. А. Позняк.* Пошук чалавека ў чалавеку *(Урокі псіхалагізму)* . . . 97

*А. А. Шалемава.* Да пытання аб тыпалагічнай суаднесенасці лірыкі Якуба Коласа і А. С. Пушкіна . . . 102

*І. М. Ключановіч.* Ад адзінай праўды жыцця . . . 110

*К. Р. Хромчанка.* Якуб Колас у італьянскім друку . . 124

*І. А. Навумовіч.* На шырокую дарогу *(Якуб Колас і «Маладняк»)* . . . 134

*В. П. Рагойша.* «Дарагі Іван Капітонавіч!» . . . . 143

*А. А. Лойка.* «Ад казак вечароў, да песень дудароў...» . 148

З глыбінь народных / [Рэдкал.: А. А. Лойка
З-11 (гал. рэд.) і інш.].— Мн.: Выд-ва БДУ, 1982.—
166 с.
70 к.

Зборнік, прысвечаны 100-гадоваму юбілею народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, склалі новыя даследаванні супрацоўнікаў кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна С. Александровіча, А. Лойкі, В. Рагойшы, К. Хромчанкі, М. Яфімавай і інш.

Разлічаны на літаратуразнаўцаў, выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ, настаўнікаў-славеснікаў.

З $\frac{4603010000—036}{М317—82}$ 56—82

ББК 83.3Бел 7
8Бел.2

ворку пра некаторыя асаблівасці стылю народнага паэта Беларусі.

Найперш акцэнтуем увагу вучняў на жанравым багацці лірыкі Коласа. Тут і адкрыта грамадзянскія вершы («Да працы!», «Голас зямлі»), і філасофскія («Наперад!»), і пейзажныя («Чымган»). Своеасаблівасцю творчасці паэта з'яўляецца «размыванне» жанравых межаў яго лірыкі. Так, у пейзажных творах могуць выяўляцца матывы выразна грамадзянскія («У родных мясцінах», першая частка «Чымгана»), агульнафіласофскія (другі санет з санетнай нізкі «Наперад!») або нават інтымныя (другая частка «Чымгана»). Разнастайны паэт і ў рытмічным малюнку вершаў, спосабах іх страфічнай арганізацыі. Нават у тых пяці творах, што вывучаюцца па праграме, мы сустракаем ямб чатырохстопны («Да працы!», «Голас зямлі») і пяцістопны («У родных мясцінах»), чатырохстопны амфібрахій («Наперад!», першая частка «Чымгана»), чаргаванне чатырохстопнага ямба з трохстопным (другая частка «Чымгана»). Што датычыць страфаў, то тут і чатырохрадковыя строфы з перакрыжаванай рыфмоўкай («Да працы!», «Голас зямлі»), і чатырохрадковыя строфы з апаясальнай рыфмоўкай («Чымган», «У родных мясцінах»), і санет («Наперад!»). Прычым Колас некалькі мадыфікуе рытмічны малюнак санета. Замест класічнага пяцістопнага ямба ён ужывае ў санеце чатырохстопны амфібрахій. Тры санеты, звязаныя адной тэмай, ён аб'ядноўвае ў своеасаблівы санетны трыпціх. Усё гэта сведчыць і пра багацце вершаванай формы Якуба Коласа, і пра жаданне ўзбагаціць, пашырыць выяўленчыя мажлівасці формы. А гэта, у сваю чаргу, было абумоўлена імкненнем паўней і глыбей выявіць думкі і пачуцці савецкага чалавека ў розныя перыяды гісторыі нашай краіны.

**В. І. Локун**

## ДУХОЎНЫ ВОБЛІК КОЛАСАЎСКАГА ГЕРОЯ

Вядома, што творчасць кожнага сапраўднага пісьменніка цесна звязана з гісторыяй свайго народа, што ж датычыцца Коласа, то яго можна з упэўненасцю назваць летапісцам духоўнага развіцця беларускага народа. Трылогія «На ростанях» гэтак жа, як дзве кнігі

М. Шолахава «Узнятая цаліна», раманы К. Федзіна «Першыя радасці», «Незвычайнае лета», «Касцёр», адносіцца да тых твораў савецкай літаратуры, ідэйна-філасофскі змест і эпічная структура якіх выяўляе з вялікай нагляднасцю зменлівы рух часу.

Колас здолеў паказаць этап сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення Беларусі. Ужо ў «Новай зямлі» ўзрасла мастацкая тэндэнцыя сцвярджаючага, услаўляючага пачатку ў адлюстраванні жыцця народа. Паэтызацыя сялянскай працы, працоўнага чалавека, яго духоўнага багацця, унутранай прыгажосці — усё гэта становіцца пераважаючым у творчасці беларускага песняра.

«Велічная эпічная атмасфера «Новай зямлі»,— слушна піша А. С. Майхровіч,— аказалася вельмі спрыяльнай глебай для нараджэння новага героя, мужыцкага сына, дамінуючай рысай якога стане актыўнасць у адносінах да жыцця. Лінія развіцця гэтага вобраза ўключае прадстаўніка свету дзяцінства ў «Новай зямлі» Костуся, героя ў лірычных адступленняў паэмы, і працягваецца далей ужо ў паэме «Сымон-музыка»[1]. Такім чынам, заўважае далей даследчык, ужо «Новай зямлёй» было прадыктавана з'яўленне новага і больш дзейснага героя — музыкі Сымонкі.

З паэмай «Сымон-музыка» ў беларускую літаратуру прыйшоў душэўна багаты чалавек, які вельмі чулы да прыроды, нават зніtаваны з ёю, вобраз з падкрэсленым імкненнем пазнаць Сусвет і таямніцы жыцця. Герой выразна інтэлектуальнага плана, ён ужо выспеў да думкі аб неабходнасці проціпаставіць «сілу сіле». Актыўнасць героя, яго бунтарская сутнасць — адначасова важны паказчык эвалюцыі ідэйна-эстэтычнай пазіцыі самога пісьменніка, які здолеў увасобіць у мастацкіх вобразах вельмі рухавыя і зменлівыя з'явы рэчаіснасці. Колас прыйшоў да думкі аб заканамернасці працэсаў, якія адбываюцца ў рэчаіснасці, і далей — аб неабходнасці іх зразумець, пазнаць. Адсюль і своеасаблівы, наватарскі стыль паэмы «Сымон-музыка» з выразна акрэсленымі элементамі даследавання, аналізу. Гэтыя элементы знойдуць далейшае сваё развіццё ў першай кнізе трылогіі «На ростанях».

«Каштоўнасць жывых творчых ідэй у тым і заключэ-

---

[1] *Майхрович А. С.* Эстетические взгляды Якуба Коласа.— Мн.: Навука і тэхніка, 1970, с. 99.

ецца, што яны накіроўваюць пошукі пісьменніка, вядуць да мастацкіх адкрыццяў, а не замяняюць іх; яны асвятляюць жыццё, а не засланяюць яго. Рэчаіснасць падвяргае строгай праверцы творчыя замыслы і канцэпцыі пісьменніка»[2]. Ідэя паэмы «Сымон-музыка» — ідэя гордай непакоры, гераічнага ахвяравання сабой у імя высокіх мэт — адпавядала свайму часу. Новая ступень гістарычнага развіцця народа вылучыла і больш высокае патрабаванне да чалавека. Жыццё чакала людзей вялікіх духоўна-інтэлектуальных магчымасцей, людзей з усвядомленым высокім грамадскім абавязкам перад родным краем.

У адрозненне ад герояў «Новай зямлі», Сымонка ў барацьбе з жорсткімі сіламі, якія не давалі яму ўзлёту, хацелі закабаліць яго свабодалюбівую натуру, выходзіць пераможцам. Колас вывеў свайго героя на неабсяжныя прасторы жыцця, але адсутнасць пэўнай, практычнай мэты паклала адбітак на мастацкім рашэнні гэтага вобраза. Ідэя паэмы «Сымон-музыка» раскрываецца ў рамантычна-узнёслых, абагульненых вобразах. Эмацыянальна-духоўны воблік героя ў значнай ступені вылучаецца са звычайнага, будзённага жыцця і з'яўляецца даволі абстрактным. Такім жа абстрактным было і яго імкненне служыць народу.

Новая ж эпоха патрабавала і новага героя, чалавека канкрэтных грамадскіх спраў, і Колас-мастак не мог не адазвацца на гэта, больш таго, усёй сваёй папярэдняй творчасцю ён падрыхтаваўся да ўспрыняцця і паказу новага чалавека. Герой «Новай зямлі» адчуваў пільную патрэбу ў свабодзе, імкнуўся да яе, але абставіны аказаліся мацнейшыя,— паспытаць волі яму не давялося; Сымонка, як той лермантаўскі Мцыры, пазнаў шчасце ўзлёту, шчасце зліцця з народнай стыхіяй, удыхнуў у сябе свежае паветра, імкнуўся да дзейнасці, быў увесь у руху, у імкненнях, але канкрэтнай справы усё ж у яго не было. Лабановіч жа пайшоў далей, ён — выхадзец з народа, герой трылогіі «На ростанях», атрымоўвае адукацыю і зноў вяртаецца ў самую глуш, каб абудзіць яе ідэяй новага жыцця, ідэяй рэвалюцыі. Так выяўляецца паступовасць, паслядоўнасць і заканамер-

---

[2] *Храпченко М. Б.* Творческая индивидуальность писателя и развитие литературы.— М.: Сов. писатель, 1970, с. 17.

насць росту Коласа-мастака у асваенні сацыяльнай рэчаіснасці.

Паэмы «Новая зямля», «Сымон-музыка», трылогія «На ростанях» — гэта вехі творчай эвалюцыі пісьменніка, этапы станаулення яго яркай творчай індывідуальнасці. Моцныя сваей народнасцю, дэмакратызмам, напоуненыя высокімі ідэаламі сацыяльнай справядлівасці і гуманізму, яны адлюстроувалі духоунае узмужанне беларускага народа, гісторыя якога станавілася аб'ектам адлюстравання літаратуры.

Сярод твораў беларускіх празаікаў 20-х гадоў адно з цэнтральных месц займаюць аповесці з трылогіі «На ростанях». Ствараючы мастацкія вобразы трылогіі, пісьменнік адштурхоувауся не ад агульных лагічных перадумоў, а ад успрымання самога жыцця, не ад абстракцый, а ад канкрэтных з'яў рэчаіснасці. Творча успрыняушы лепшыя здабыткі рускай класічнай літаратуры, у прыватнасці традыцыі Пушкіна, Гогаля, Чэхава, Горкага, Колас пад вуглом гледжання нацыянальных патрэб адлюстравау цэлы гістарычны этап жыцця беларускага Палесся, стварыушы пры гэтым па-мастацку паунакроуныя вобразы перадавых людзей таго часу — прадстаунікоў беларускай інтэлігенцыі пачатку XX ст.

...Малады настаунік Андрэй Лабановіч, які толькі-толькі скончыу настаўніцкую семінарыю, прыязджае у глухі палескі куток — лясную вёску Цельшына — вучыць сялянскіх дзяцей грамаце. Лабановіч — сялянскі сын, ён нарадзіуся у вёсцы, у беднай сям'і, таму едзе на свае першае месца працы з самымі лепшымі намерамі, з усведамленнем сваёй высокай асветніцкай місіі. Ён любіць дзяцей, умее іх зацікавіць, імкнецца усяляк дапамагчы. Чалавек неспакойны, дапытлівы, ён імкнецца пазнаць таямніцы жыцця, вырашыць спрадвечнае філасофскае пытанне аб жыцці і смерці. Аднак у яго светапоглядзе яшчэ вельмі многа абстрактных, а то і проста схаластычных меркаванняў, што сведчыць перш за усё пра схаластычны характар навучання у настаўніцкіх семінарыях канца XIX — пачатку XX ст. Возьмем, для прыкладу, унутраны маналог Лабановіча пасля таго, як ён даведауся пра смерць Андрэя Лабудзькі, з якім яны разам закончылі семінарыю. З аднаго боку, смерць сябра мацуе яго думку пра «няпэунасць і нязначнасць людскога лёсу», пра тое, што «смерць усемагутная і не-

адхільная», яна забірае не толькі самога чалавека, але і яго імкненні, незалежна ад таго, добрыя яны ці благія. Фантазія малюе жахлівую уяву аб мёртвым сябру, які «цяпер — труп!». Настаўнік прыходзіць да песімістычнага заключэння аб немэтазгоднасці жыцця: «Ці варта нагул жыць? Жыць, каб памерці?» Усе гэтыя і далейшыя развaжанні Лабановіча — больш поза, даніна кніжнасці, рацыяналістычнасці, як і яго спроба разабрацца ў псіхалогіі самазабойцы. Наіўнасць і марнасць маладога настаўніка ў вырашэнні пытання аб смяротнасці людзей вельмі паказальныя для характарыстыкі пачатковага этапа ідэйнай эвалюцыі героя. Не будзе памылкай, калі скажам, што першая кніжка трылогіі з'яўляецца найбольш дасканалай з мастацкага боку, найбольш важнай і каштоўнай у паказе выспявання героя, станаўлення яго светапогляду. Хоць перш чым скласціся ў асобу са стойкімі ўнутранымі прынцыпамі, з канкрэтна вызначанай мэтай, з трывалай жыццёвай устаноўкай, Лабановічу трэба будзе яшчэ прайсці агромністы і складаны шлях ідэйных і духоўных пошукаў.

Настаўнік едзе ў палескую глуш з цвёрдым намерам служыць людзям, абудзіць у вучняў крытычны розум, думку, зацікаўленасць да з'яў прыроды, грамадства. Яго дэмакратычна-асветніцкая ўстаноўка вельмі характэрна для людзей яго кола. Турсевіч, калега Лабановіча, выказвае блізкую, можна сказаць, нават тыповую для іх, перадавых настаўнікаў, думку: «Чалавек жыве дзеля дабра, для служэння праўдзе, каб стварыць нейкія вартасці жыцця і каб стаць карысным для іншых». Усё гэта вельмі правільныя, але і вельмі агульныя фразы. І перш за ўсё таму, што народ, у імя якога яны гатовы аддаць не толькі веды і сілы, але нават свае жыцці, у іх уяўленні застаецца нейкай цёмнай, неадукаванай і, галоўнае — абстрактнай масай. Па гэтай прычыне ў іх і не атрымліваецца з людзьмі агульнай размовы, ім, настаўнікам, пакуль што яшчэ цяжкадаступныя горды, мудры і скрытны свет палешукоў, іх своеасаблівая псіхалогія, часам алагічныя матывы паводзін. Прыгадаем у сувязі з гэтым бойку Кандрата Куксы з Лявонам Шкуратам ці гумарыстычную замалёўку прыняцця прычасця ў каплічцы вёскі Цельшына дзедам Мікітай (непаўторны ў нашай літаратуры вобраз па свайму мастацкаму вырашэнню).

Жыццё Лабановіча ў вёсцы адасобленае. Адзінота

яго заканамерная, бо спроба зблізіцца з палешукамі скончылася няўдачай. Наладжаныя вечары, на якія спачатку ахвотна ішлі і пажылыя і дзеці, задавальнення не прынеслі: людзі мелі патрэбу ў думцы практычнай, агульныя фразы праходзілі па-за іх свядомасцю. Так званая народная маса не прыняла настаўніка «за свайго». Вышэйшае цельшынскае «вобчаства» ў асобе пісара, лясніча, старасты і г. д. Лабановіч адвергнуў сам. Іх мяшчанская псіхалогія, раўнадушша, чэрствасць душы аказаліся чужымі для яго дапытлівай і багатай натуры.

Духоўная ізаляцыя, няпэўнасць у адносінах з каханай дзяўчынай прыводзяць Лабановіча да поўнай незадаволенасці жыццём у Цельшыне. У яго нараджаецца пратэст супраць «нявольнага ўмірання душы і зацягвання балотам». Менавіта такая «перспектыва» чакае сельскага інтэлігента (што вельмі добра ўвасоблена пісьменнікам у вобразе Саханюка), ад яе і уцякае Лабановіч у другую школу, у другую вёску, да другіх людзей. «Нельга доўга заставацца на адным месцы»,—заўважае настаўнік у пісьме да аднаго з сваіх сяброў, таму што «балота цябе заесць і ашальмуе. Няхай жыве вандроўніцтва!» Матыў вандроўніцтва, матыў дарогі вельмі выразны ў першай частцы трылогіі; ён увасабляе духоўныя пошукі героя, пошукі канкрэтных і плённых форм і метадаў барацьбы за лепшую будучыню народа.

Лабановіч акінуў вачыма ваколіцы Цельшына: «Цесна, цёмна і пуста». Кожны з герояў стараецца пазбавіцца ад акружаючай духоўнай пустаты: Турсевіч спадзяецца пазбегнуць яе ў сценах інстытута, Ядвіся — адзін з чароўнейшых і абаяльнейшых жаночых вобразаў ва ўсёй беларускай літаратуры — пакідае родны дом, вёску, ахвяруе сваім першым каханнем і ідзе служыць у маёнтак. А Лабановіч?.. На ад'ездзе ў другі куток Палесся ён ведае, што «неабходна лічыцца з тым, што народ малакультурны, кансерватыўны, не ўмее цаніць сваіх грамадскіх інтарэсаў і не прывык выступаць грамадою. Але ж яму трэба гэта гаварыць, будзіць яго, катурхаць». Як бачым, цяпер у Лабановіча мэта больш акрэсленая, больш жыццёвая, хоць па кірунку сваёму застаецца усё ж асветніцкай.

Сапраўдную буру пачуццяў вызвала ў настаўніка знаёмства з кніжачкай рэвалюцыйнага зместу. «Першае, што адчуў Лабановіч... быў страх, як бы пад нагамі за

хістаўся грунт і перад ім расчынялася нейкае бяздонне». Паступова гэта «бяздонне» пачало запаўняцца новым зместам, жыццё ставіла перад ім новыя і больш значныя задачы, патрабавала дзеянняў актыўных і бескампрамісных. Зерне, кінутае ў падрыхтаваную глебу, стала хутка прарастаць. Маленькая кніжачка зрабіла цэлую рэвалюцыю ў думках Лабановіча, паказала стан рэчаў у зусім іншым асвятленні. Рэвалюцыйнаму настрою настаўніка садзейнічала і знаёмства з настаўніцай суседняй вёскі, Вольгай Віктараўнай, праз якую ён неўзабаве звязаўся з членамі падпольнай арганізацыі.

Аднак, зрабіўшы значны крок наперад, Лабановіч яшчэ далёкі ад сапраўднага разумення рэвалюцыі. Рэвалюцыя ў яго ўяўленні — гэта нешта ўзнёсла-рамантычнае, яна прыцягвае яго сваёй таямнічай рызыкай, незвычайнасцю, яго не палохаюць ні астрогі, ні Сібір, таксама ахінутыя флёрам рамантыкі.

Прайшоўшы складаны шлях ад абстрактнага разумення дабра і зла, праз рамантычна павярхоўнае ўспрыманне рэвалюцыі, Лабановіч зробіць заключэнне, што «ісці далей па шляху барацьбы адзіночкай-саматужнікам нельга. Патрэбна згодная, па выпрацаванаму плану, работа тысяч людзей, якая біла б у адзін пункт, а для гэтага трэба арганізацыя, у дадзеным выпадку настаўніцкая арганізацыя». І Лабановіч — «беспартыйны дэмакрат» [3], як трапна ахарактарызаваў яго І. Навуменка, заканамерна ў фінале трылогіі прыходзіць да сустрэчы з партыяй бальшавікоў, менавіта з той сілай, якая найпаўней увасабляла ў сваёй дзейнасці інтарэсы працоўнага народа. Сустрэча з бальшавіком Галубовічам, доўгія гутаркі з гэтым чалавекам, асабліва яго запавет уступіць «у цесную сувязь з марксістамі, бальшавікамі» зрабілі велізарнае ўражанне на Лабановіча,— гэта і ёсць той пераломны момант, за якім канчаюцца «ростані» і адкрываюцца «прасторы жыцця» (І. Навуменка).

Такім чынам, коласаўскі герой прайшоў у сваім развіцці пакутлівы і складаны шлях: ад свабодалюбівых імкненняў («Новая зямля») праз рамантычна-ўзнёслае, але досыць пасіўнае жаданне тварыць дабро («Сымон-музыка») да этапа рэвалюцыйнай барацьбы (трылогія «На ростанях»).

---

[3] *Навуменка І. Я.* Якуб Колас: Духоўны воблік героя.— Мн.: Выд-ва БДУ, 1981, с. 218.